# ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ ДА ФАРМІРАВАННЯ Ў ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ КАШТОЎНАСНАГА СТАЎЛЕННЯ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МОВЫ

# PROFESSIONAL TRAINING OF FUTURE TEACHERS TO THE FORMATION OF CHILDREN OF PRESCHOOL AGE VALUES RELATED TO THE NATIONAL LANGUAGE

*Н. С. Старжынская, N. S. Starzhynsraya*
*БДПУ, г. Мінск*

***Анатацыя.*** *Разглядаюцца зыходныя палажэнні пабудовы зместу падрыхтоўкі студэнтаў факультэта дашкольнай адукацыі да рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу да навучання дзяцей беларускай мове, што забяспечвае засваенне нацыянальнай мовы праз культуру і нацыянальнай культуры праз засваенне мовы.*

***Abstract.*** *Sets out the original position of the construction of the content of training of students of the faculty of preschool education to really literature approach to teaching children the Russian language, which provides mastering of the national language through culture and culture through language.*

Репозиторий БГПУ

Якасць вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе развіцця грамадства вызначаецца сфарміраванасцю ў студэнтаў абагульненых, інтэлектуальных і прафесіяльна-прадметных кампетэнцый, якія б дазволілі выпускнікам актыўна і творча ўключацца ў вырашэнне навукова-вытворчых і навукова-даследчых, сацыяльна-культурных і інш. задач у прафесійнай дзейнасці.

Спецыфічныя задачы стаяць перад педагагічнай адукацыяй. Выпускнік, які атрымаў кваліфікацыю педагога ўстановы дашкольнай адукацыі, павінен быць гатовы вырашаць адукацыйныя і даследчыя задачы, канструяваць змест навучання і выхавання на розных узроставых ступенях дашкольнай адукацыі. Яго прафесійная дзейнасць накіравана на пазітыўную сацыялізацыю і індывідуалізацыю дзяцей дашкольнага ўзросту, фарміраванне іх агульнай і нацыянальнай культуры.

Культурнае ядро сучаснай адукацыі складаюць менавіта нацыянальныя каштоўнасці. Далучэнне да іх дазволіць забяспечыць станаўленне асобы дзіцяці, выхавання ў яго эмацыянальна-каштоўнаснага стаўлення да наваколля, нацыянальнай культуры. Найважнейшым складнікам і выражэннем культуры з'яўляецца нацыянальная мова.

Маўленчае развіццё дашкольнікаў у Беларусі ажыццяўляецца ў сітуацыі руска-бела-

рускага двухмоўя. Гэты факт абумоўлівае неабходнасць рэалізацыі білінгвальнай дашкольнай адукацыі – засваення асобай культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту, каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры сродкамі дзвюх моў, выхавання ў дашкольнікаў каштоўнаснага стаўлення і да рускай, і да беларускай моў.

Як паказваюць назіранні і аналіз псіхалінгвістычнай і публіцыстычнай літаратуры, ў Беларусі на рэфлексіўным узроўні глыбока ўкаранiўся нацыянальны нігілізм, уяўленне, што беларуская мова – гэта мова фальклора, пісьменнікаў і паэтаў, але сучаснаму чалавеку ведаць яе неабавязкова. Блізкароднаснасць рускай і беларускай моў прыводзіць да інтэрферэнцыі дзвюх моўных сістэм у маўленні білінгва. На быцiйным узроўні гэта лічыцца нормай. На духоўным узроўні камунікатыўная катэгорыя “беларуская мова” ў свядомасці многіх прадстаўнікоў насельніцтва Беларусі не адносіцца да нацыянальных каштоўнасцей.

Паводле І. Я. Лернера, культура засвойваецца ў форме чатырох элементаў: ведаў, вопыту дзейнасці ў адпаведнай сферы; творчасці, а таксама адносін да дзейнасці, яе аб’ектаў, усяму, што з ёю звязана, суаднесеных з сістэмай каштоўнасцей чалавека. Як правіла, навучанне роднай мове прадугледжвае першыя два кампаненты, у вядомай ступені можна гаварыць пра далучэнне дзяцей да моватворчасці і пераносу прыёмаў маўленчай дзейнасці ў новыя ўмовы. У меншай ступені звяртаецца ўвага на апошні момант – станоўчае, каштоўнаснае стаўленне да мовы і маўленчай дзейнасці.

Умовай фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту элементарнага асэнсавання беларускай мовы як каштоўнасці выступае рэальнае перажыванне каштоўнаснага вопыту яе выкарыстання. Неабходна фарміраваць у дзяцей уяўленні аб нацыяльнай мове як “галоўнай мове” Беларусі, пазнаёміць з выразнымі сродкамі мовы, выкарыстоўваць беларускую мову для паведамлення экстралінгвістычнай і лігнвакультураведчай інфармацыі. Сучасным падыходам да развіцця беларускага маўлення ў рускамоўных дашкольнікаў выступае лінгвакультуралагічны падыход, метадычнымі напрамкамі рэалізацыі якога з’яўляюцца: спасціжэнне каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры; засваенне дзецьмі нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы; навучанне беларускай мове ў дыялозе культур.

Далучэнне дзяцей да каштоўнасцей нацыянальнай культуры прадугледжвае ўключэнне ў змест адукацыі культуразнаўчых, перш за ўсё, мастацкіх тэкстаў, што адлюстроўваюць ментальны вопыт, культурныя асаблівасці беларускага народа. На аснове такіх тэкстаў адбываецца азнаямленне з культурным вопытам народа, этычнае і эстэтычнае ўздзеянне на думкі, пачуцці і паводзіны дзяцей.

Фарміраванню ў дзяцей каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай мовы садзейнічае ўключэнне ў змест навучання выказванняў пра Беларусь і беларускую мову, якія належаць выбітным стваральнікам культуры. Для дашкольнікаў гэта ў першую чаргу вершы пра родную мову, краіну Беларусь, беларусаў, якія яны завучваюць і дэкламуюць.

У нацыянальна маркіраваных адзінках мовы культуразнаўчая інфармацыя можа быць пададзена ў двух аспектах. Першы пласт нацыянальна маркіраваных адзінак складаюць словы, якія абазначаюць рэаліі духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, што адлюстроўваюць своеасаблівасць нацыянальнай карціны свету (назвы народных звычаяў і свят, пабудоў, традыцыйнага адзення, абутку, страў нацыянальнай кухні, прадметаў народнага мастацтва, найменне прамежкаў часу, напрыклад, месяцаў і інш.

Да другога пласту нацыянальна маркіраваных адзінак мовы, у якіх праяўляецца культуразнаўчае інфармацыя, адносяцца: устойлівыя параўнанні, заснаваныя на супастаўленні рыс характару, паводзін чалавека з жывёламі, раслінамі (надзьмуўся, як сыч); фразе-

Репозиторий БГПУ

ялагізмы (як серада на пятніцу) сімвалы (вярба – увасабленне жыццёвай сілы, устойлівасці) і інш.

Трэці напрамак рэалізацыі лінгвакультуразнаўчага падыходу – дыялог культур – прызваны фарміраваць ў дзяцей ўяўленні пра самабытнасць і ўнікальнасць беларускай мовы і культуры шляхам яе параўнання з рускай мовай. Гэта садзейнічае, па-першае асэнсаванню дзецьмі агульнага і адметнага ў нацыянальных традыцыях і выхаванню павагі да культурных каштоўнасцей абодвух народаў, а па-другое, як ужо адзначалася вышэй, папярэджанню і пераадоленню моўнай інтэрферэнцыі.

Такім чынам, навучанне беларускай мове як другой роднай мове ажыццяўляецца па прынцыпе “мова праз культуру – культура праз мову” (Е. І. Пасаў).

Падрыхтоўка студэнтаў факультэта дашкольнай адукацыі да фарміравання ў дзяцей каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай мовы здзяйсняецца сродкамі розных дысцыплін. Адным з найбольш дзейнасных у гэтым плане, на наш погляд, з’яўляецца курс “Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту” – вучэбная дысцыпліна, якая змяшчае сістэматызаваныя навуковыя веды пра развіццё маўлення і беларускамоўных зносін дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Мэта выкладання і вывучэння названай вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучага педагога ў галіне методыкі развіцця беларускага маўлення рускамоўных дзяцей дашкольнага ўзросту; фарміраванне падрыхтаванасці студэнтаў да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-метадычнай дзейнасці ў галіне маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Задачы выкладання вучэбнай дысцыпліны складаюцца з фарміравання ў студэнтаў – будучых выхавальнікаў дзяцей дашкольнага ўзросту, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, аснова якіх заключаецца ў ведах і ўжыванні:

– сучасных канцэпцый і тэхналогій навучання другой мове, развіцця беларускага маўлення і навучання нацыянальнай роднай мове дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму;

– дыягностыкі, праектавання і канструявання працэсу развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя;

– эфектыўных метадаў і прыёмаў развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

У першых чатырох тэмах курса раскрываюцца тэарэтычныя асновы развіцця беларускага маўлення і навучання беларускай мове рускамоўных дашкольнікаў у сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. У гэтай сувязі разглядаюцца механізмы і ўмовы авалодання дзецьмі роднай і другой мовамі. Асаблівая ўвага надаецца канцэптуальным асновам беларускамоўнага развіцця рускамоўных дашкольнікаў, іх нацыяльна-моўнай адукацыі.

Наступныя тэмы можна разглядваць як тэарэтыка-метадычныя. У кожнай з іх пытанні методыкі развіцця беларускага маўлення і навучання беларускай мове цесна звязаны з данымі аб асаблівасцях развіцця маўлення дзяцей на першай засвоенай мове (рускай), параўнальным матэрыялам па беларускай і рускай лексіцы, граматыцы, фанетыцы. Менавіта падчас вывучэнне гэтых тэм студэнты вучацца адбіраць дзіцячы лінгвакультуразнаўчы матэрыял, які ўключае: святы, традыцыі, звычаі беларускага народа; песні, танцы, казкі, паэзію, апавяданні, народныя гульні; прыказкі, прымаўкі, рыфмоўкі, чыстагаворкі, скорагаворкі і г. д., на аснове якога адбываецца азнаямленне дзяцей з культурным вопытам народа. Важна, што ў працэсе азначанай работы яны самі глыбей знаёмяцца з такім матэрыялам.

Репозиторий БГПУ

Шмат увагі надаецца азнаямленню будучых выхавальнікаў з нацыянальна маркіраванымі адзінкамі беларускай мовы, асабліва тымі, што сустракаюцца ў названых вышэй творах.

Спецыфічнае месца займае апошняя тэма, звязаная з выкарыстаннем народнай педагогікі ў развіцці маўлення дзяцей, азнаямленнем іх з нацыянальнымі традыцыямі і культурай беларускага народа. Гэтая тэма ўяўляе сабой па сутнасці ўвядзенне студэнтаў у беларусазнаўства. Гэты матэрыял цесна звязаны з папярэднім – тэарэтыка-метадычным. Акрамя таго, тут таксама разглядваецца методыка азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з беларускім фальклорам, народнымі гульнямі, народнай цацкай, прадметамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, правядзення беларускіх народных свят. Студэнты знаёмяцца са звычаямі беларускага народа, вучацца ўжываць да месца ў выхаваўчым працэсе малыя формы фальклору. Гэта спрыяе ўзмацненню практыка-арыентаванай накіраванасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

У выніку студэнты авалодваюць неабходнымі кампетэнцыямі па методыцы развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, фарміравання ў іх каштоўнаснага стаўлення да беларускай культуры і ў прыватнасці – да беларускай мовы як мовы свайго народа.

Репозиторий БГПУ